КНІГА ГОДУ 2017

# Правілы

## Агульнае

1. Беларускі ПЭН-цэнтр абвяшчае прэмію “Кніга году”.

2. Мэта прэміі ў тым, каб беларускія літаратары самі абралі найлепшую беларускую кнігу.

3. Прэмія прысуджаецца штогод за найлепшую арыгінальную кнігу, упершыню выдадзеную ў папярэднім годзе.

4. Кніга павінна быць напісаная беларусам ці ў Беларусі на любой мове, якой карыстаюцца беларусы.

5. Пераможца – адна кніга, створаная ў жанрах “мастацкая проза”, “нон-фікшн”, “паэзія” і “эсэістыка”. У спрэчных выпадках жанр твораў вызначаецца аргкамітэтам.

## Журы

6. Любы пісьменнік і перакладчык на беларускую мову, які цягам апошніх 7 гадоў выдаў хаця б адну кнігу ў жанрах, пазначаных у п. 5, мае права ўвайсці ў склад журы.

Для гэтага неабходна да 5 мая 2018 г. або запоўніць адпаведную форму на сайце www.kniha.by, або даслаць заяўку на электронны адрас: info@pen-centre.by, або звярнуцца ў ПЭН-цэнтр прыватна ці па тэлефоне: +375 17 3487662. У заяўцы павінны быць пазначаныя:

- Імя і прозвішча сябра журы;
- Дадзеныя хаця б адной кнігі, апублікаванай за апошнія 7 гадоў;
- Назвы ад адной да трох кніг, якія сябар журы лічыць найлепшымі з выдадзеных за 2017 год і якія адпавядаюць пп. 3, 4 і 5 гэтага Палажэння.

## Аргкамітэт

7. Аргкамітэт прызначаецца Радай Беларускага ПЭН-цэнтра. Аргкамітэт рэгіструе сяброў журы, падлічвае галасы, інфармуе грамадскасць пра ход прэміі. Сябры аргкамітэта маюць права ўваходзіць у журы прэміі.

## Выбар кнігі году

8. Кожны сябар журы называе аргкамітэту ад адной да трох найлепшых, на ягоную думку, кніг, выдадзеных у папярэднім годзе. Сябры журы не маюць права галасаваць за кнігі ўласнага аўтарства.

9. Кніга, якая называлася часцей за іншых, перамагае.

10. Інфармацыя пра галасаванне кожнага сябра журы публікуецца на старонцы прэміі.

## Уручэнне і ўзнагароды

11. Уручэнне адбываецца ў першай палове 2018 года.

12. Аўтар кнігі-пераможцы атрымлівае грашовую ўзнагароду.